«Медицинский вестник»
№ 30
(25 июля
2024 г.)

асоба

# Р_

## рацыянальны рамантык

Успамінае Тамара Зіматкіна: «Прыехалі на канферэнцыю. Я з важкай сумкай, Юрый Міхайлавіч — з тоненькім дыпламатам. Ён дапамагае мне несці сумку, а я думаю: «Як гэта можна? У дыпламат жа не памесціцца ўсё». А там, у яго дыпламаце, ляжаць дысертацыя вучня, шчыльна скручанае трыко, гальштук, электрабрытва, нататнік, тонка завостраны аловак і ручка — усё акуратненька складзена. Я тады падумала: «Гэта ж трэба! Такая арганізацыя! А ў мяне вялікая поўная сумка і я пры гэтым яшчэ нешта забыла, нечага не ўзяла». Такі быў чалавек — рацыянальны».

«…А ў Маскве была такая Гарачава, доктар навук, вучаніца Браўнштэйна, займала нейкую пасаду ў забеспячэнні, — расказвае Аляксандр Навумаў, згадваючы імёны з савецкай навуковай мінуўшчыны. — Яна ў мяне неяк спытала: «Ну, як там наш фантазёр?» Я, на той час аспірант, ашалеў, пачуўшы такое пра Астроўскага. Аказваецца, у Маскве яго яшчэ і вось так успрымалі. Але ж навуковыя фантазіі — гэта рухавік навукі. На мільён фантазій — адна Нобелеўская».

# О_

## оксітыямін

Антаганіст тыяміна. Як злучэнне з антывітамінным эфектам можа выкарыстоўвацца для падаўлення рэакцый, актываваных паталагічным працэсам. Даследаванні, якія праводзіліся супрацоўнікамі Астроўскага ў 1980-х на пацуках, паказалі, што оксітыямін тармозіць рост злаякасных новаўтварэнняў. Таму што пухліны без разбору паглынаюць усё, што ім спрыяе, у тым ліку і малекулы вітамінаў, але адрозніць вітамін ад антывітаміна яны няздольныя, таму калі ім падсунуць апошні, схопяць і яго. Так, назапашваючыся ў пухліне, оксітыямін тармозіць яе рост. Але паралельна ў тканках адбываецца процьма розных іншых эфектаў, якія супрацоўнікі інстытута інтэрпрэтавалі кожны па-свойму, і таму аб малекулу оксітыяміну было зламана нямала дзідаў. Злучэнне з гаваркой прыстаўкай «анты» кіравала навуковымі лёсамі, маланкамі спрэчак рассякала інстытут напалам. Час да гэтай пары не паставіў у тых спрэчках кропку.




# Ў

**— гэта і сімвал Полацка, дзе Юрый Астроўскі пачаў займацца навукай, і сімвал яго любові да Беларусі, якую ён не захацеў пакінуць, нягледзячы на прапановы замежных калег пасяліцца дзе-небудзь у Фрайбургу ці Люксембургу, і літара мовы, на якой ён пісаў не толькі надзённыя роздумы, не толькі артыкулы, у якіх прыводзіў аналіз «біялагічнага грунту народаў», і не толькі «Тэстамент», у якім ёсць сярод іншых такія словы: «Адважна рабі першыя крокі», «Стаўся да свайго народа як да ўласнай сям'і», «Навучайся паважаць іншыя народы, але не губляй пры гэтым уласнага гонару і годнасці».**

**На мове, якой належыць літара Ў, Юрый Астроўскі пісаў і вершы. Адзін з іх у размове для кнігі вельмі кранальна, з дрыготкай у голасе прачытала Алена Радута, вучоны сакратар Інстытута біяхіміі біялагічна актыўных злучэнняў НАН Беларусі, так цяпер называецца заснаваны Астроўскім інстытут.**

***Я люблю глухія шумы
У лясной глушы.
Я люблю згубіцца з думай
На лясной мяжы,
Дзе так сумна, ціха, змрочна
На ссівелы мох
З перапуджаных узбочын
Паў перапалох.
Адпачну крыху ад болю,
Ад няпраўд, маны,
Удыхну лясную волю
З пахам сасніны.***

**«Бываюць у працы складанасці, — гаворыць Алена Радута. — І здаецца, усё кінула б. Але партрэт Астроўскага на сцяне… Паглядзіш на яго — і думаеш: а яму ж і не было лягчэй. Яму ж і цяжэй было. І хіба ён камусьці паскардзіўся? Не».**

с. 18

с. 17

# АЛФАВІТ АСТРОЎСКАГА

## С — строгі

На трэцім паверсе Інстытута біяхіміі працавалі жанчыны, якія заўзята палілі. Нягледзячы на саліднасць узросту і занятку, яны хаваліся ў курылках, як школьніцы. Хаця Астроўскі не сказаць каб сварыўся. Проста ўшчуваў: «Вы ж доктар». Ён быў супраць курэння і супраць прастою ў працы. Сам ён не меў шкодных звычак, а тыя, хто іх меў, перад ім сваіх звычак саромеліся, з-за чаго гэты мяккі чалавек у іх вачах выглядаў надта строгім. Хаця нехта іншы скажа, што Астроўскі і сапраўды быў строгі. І гэта будзе такая ж праўда, як факт яго мяккасці.



## К — Каралінскі інстытут

Калі з'явіліся публікацыі пра метабалічную прыроду алкагалізму, сусветная біяхімічная грамадскасць аўтарам зацікавілася. «Да нас зачасцілі прафесары з Каралінскага інстытута, — гаворыць Аляксандр Навумаў. — Астроўскага запрасілі папрацаваць там, даўшы карт-бланш на даследаванні. Там, у Швецыі, ён дакладна ўстанавіў, што этанол — натуральны метабаліт, які сінтэзуецца не толькі ў аднаклетачных арганізмах і не толькі шляхам бражэння. Значыць, нейкую ролю ён павінен выконваць. Тым больш што была выяўленая залежнасць: жывёлы, якія выбіраюць этанол, маюць нізкі яго ўзровень. Трэба было проста працягнуць даследаванні і неяк адказаць на ўзнікаючыя пытанні. І калі б Астроўскі не захварэў і не памёр заўчасна, хто ведае, ці не атрымаў бы ён Нобелеўскую прэмію. Ён быў да яе вельмі блізка».

Юрый Астроўскі разумеў, што навука не развіваецца ў ізаляцыі, што знаходкі яго супрацоўнікаў павінны агучвацца сусветнай навуковай грамадскасці, што трэба ім усім выступаць на прэстыжных канферэнцыях і друкавацца ў замежных выданнях, таму, па-першае, увёў для супрацоўнікаў заняткі англійскай мовай — двойчы на тыдзень у працоўны час. Не адыходзячы далёка ад сваіх «варбургаў», храматографаў, цэнтрыфуг і дзюараў, кожны атрымліваў гэтыя ўрокі бясплатна. Сам Юрый Міхайлавіч адвучыўся на курсах англійскай мовы ў Маскве два гады яшчэ ў 1940-х. Па-другое, адзін дзень на тыдзень прынята было гаварыць па-англійску. Па-трэцяе, даклады на традыцыйных «біяхімічных панядзелках» перыядычна таксама трэба было рабіць па-англійску і па-англійску ж іх абмяркоўваць: задаваць пытанні, даваць адказы, выказваць меркаванні, спрачацца, даводзіць свой пункт гледжання — усё па-англійску. «Таму мы былі дастаткова някепска падрыхтаваныя і не саромеліся сваёй англійскай мовы, не лезлі ў кішэню па слова», — кажа Яўген Дарашэнка. Таму выступленні замежных прафесараў перад біяхімікамі школы Астроўскага не былі ні фармальнымі, «дзеля птушачкі», ні дэкаратыўнымі, «для блезіру», а слухаліся з асаблівай увагай.

Часам і расчароўвалі. «Першы такі візіт быў асабліва паказальны, — успамінае Аляксандр Навумаў. — Прафесар пачаў нам расказваць, як расказваюць дзецям, а не вучоным. Хвілін трыццаць ён нам гаварыў, а потым быў перапынак. Юрый Міхайлавіч збірае нас у фае і пытаецца: «Як вам лекцыя?» Усе паціскаюць плячыма: «Прымітыўна». Ён: «А чаго вы маўчыце?» Мы: «А што? Як?» — «Задавайце пытанні!» І калі пачалася другая частка і пасыпаліся пытанні, гэты прафесар не мог на іх адказаць. Ён зразумеў, што прыняў вучоных за малодшую групу дзіцячага садка. Але яго лекцыя прызначалася для малодшай групы, і ён ужо не мог яе перабудаваць».

«Не трэба ідэалізаваць замежных вучоных, — працягвае Аляксандр Навумаў. — Людзі паўсюль аднолькавыя, таму нявarta думаць, што на Захадзе нейкія геніі. Проста ў іх болей грошай, ім купілі прыборы з такімі магчымасцямі, што яны проста не могуць не дасягнуць таго, чаго не дасягнуць іншыя без такіх прыбораў і грошай. У нас у лабараторыі ёсць прыбор, на якім працуе мой калега Яўген, які гэты прыбор ведае як свае пяць пальцаў. Так працаваць, як ён, больш ніхто не можа. Як вы думаеце, дзе будуць вынікі? У нас. Гродзенскі медыцынскі — адзіны ўніверсітэт у Беларусі, дзе можна, напрыклад, вызначаць узровень гомацыстэіну ў тканках. Гэта такая таксічная амінакіслата, якая і атэраслероз выклікае, і выродствы ў дзяцей, і іншае».

Прафесар Канунннікава ўспамінае таксама, што Юрый Міхайлавіч Астроўскі памёр (пасля непрацяглай цяжкай хваробы, справакаванай і бясконцай стомай, і нервовай атмасферай часу, і наступствамі працы з ізатопамі ды іншымі шкодамі) 31 снежня 1991 года. Яму было 66. «Я не памятаю, як так атрымалася, — гаворыць Ніна Паўлаўна, — але пазней на адрас Інстытута біяхіміі на імя Юрыя Міхайлавіча прыйшоў ліст са Стакгольма з запрашэннем увайсці ў лік экспертаў па вызначэнні нобелеўскіх лаўрэатаў у галіне біялогіі і медыцыны. І неяк так атрымалася, што адказ пісала я. Я напісала, што гэта вельмі ганаровае для нас запрашэнне, але, на вялікі жаль, Юрый Міхайлавіч сышоў з жыцця…»

## І — іншы

Не такі, як усе. Акадэмік, а просты ў стасунках. Мае афіцыйны дырэктарскі кабінет, але часцей яго сустрэнеш у лабараторыі. І не трэба нікому з супрацоўнікаў інстытута загадзя запісвацца да яго на прыём: калі табе трэба, тады ён цябе і прыме.

Вось што расказала кандыдат біял. навук, дацэнт Галіна Доста, якая працавала на кафедры біяхіміі Гродзенскага мединститута ад самага пачатку заснавання гэтай кафедры Астроўскім: «Памятаю такі выпадак. Ідзе Юрый Міхайлавіч па калідоры і бачыць на падлозе парашок рэактыву: нехта рассыпаў і не сабраў. Ён спакойна заходзіць у лабаранцкую, бярэ там савок і венік і падмятае рассыпанае». У гэты час прыйшоў да яго наведвальнік, а Галіна Антонаўна акурат выйшла ў калідор і заспела карціну: шэфа з венікам у руках і візіцёра, які пытаецца ў яе, дзе знайсці прафесара Астроўскага. «Я гавару: дык вось ён, наш Юрый Міхайлавіч, — працягвае Галіна Антонаўна. — А Юрый Міхайлавіч пацвярджае: «Гэта я…».

**Святлана Воцінава,** Мінск.
Фота з архіва Інстытута біяхіміі біялагічна актыўных злучэнняў НАН Беларусі.